РАЗМОВА ПА СУТНАСЦІ

# Дарогі, дзіцячыя садкі, школы і паліклінікі...

## Мэр Гродна расказаў, чым павінны займацца гарадскія ўлады

**На мінулым тыдні старшыня гарвыканкама сустрэўся з гараджанамі ў самым маладым і праблемным мікрараёне горада — Альшанцы. Падчас размовы ён расказаў аб перспектывах развіцця горада на найбліжэйшы час: калі з'явіцца анкадыспансер, чаго чакаць бязвізавым турыстам і калі завершыцца першая чарга рэканструкцыі Старога замка, ці будуць у Гродне другая кальцавая магістраль і могілкі для хатніх жывёл, а таксама аб праекце Андрэя Разіна «Сонечнае кола».**

### ГОРАД РАСЦЕ

На сустрэчу, што адбылася ў школе № 39, разам з мэрам прыйшлі кіраўнік адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Алег Бялінскі і дырэктар упраўлення капітальнага будаўніцтва гарвыканкама, дэпутат абласнога Савета Анатоль Урублеўскі, а таксама кіраўнікі профільных упраўленняў гарвыканкама.



— Вы павінны ведаць з афіцыйных крыніц, што робіцца ў горадзе, і атрымаць з першых вуснаў адказы на свае пытанні, — распачаў **мэр горада Мечыслаў ГОЙ.**

Як паведаміў галоўны архітэктар Гродна Дзмітрый Вабішэвіч, падрыхтаваны генплан развіцця абласнога цэнтра да 2030 года, які прайшоў грамадскае абмеркаванне і ў хуткім часе будзе разглядацца кіраўніком дзяржавы. Згодна з дакументам колькасць гараджан за 10 гадоў павялічыцца да 395 тысяч, а праз 20 — да 405 тысяч чалавек. Штогод гарадскія ўлады плануюць будаваць 170—180 тысяч жылых «квадратаў». Галоўным чынам актыўнае будаўніцтва будзе ісці ў мікрараёнах Грандзічы і Баранавічы, а што датычыцца Альшанкі, пакуль тэмпы ўводу жылля тут запаволяцца. Прычын некалькі, галоўныя з якіх — магутнасці па ацяпленні і каналізаванні ўжо дасягаюць свайго парога.

А між іншым ёсць адставанне развіцця інфраструктуры ад росту колькасці высотак і, адпаведна, насельніцтва. На дадзеным этапе тут ужо жыве каля 30 тысяч чалавек, а ў перспектыве навасёламі ў мікрараёне будуць лічыцца 50 тысяч. Людзей хвалюе не толькі тое, дзе жыць, але і дзе купляць ежу, як трапіць дзіцяці ў садок ці школу побач з домам, наведаць урача ў сваім раёне, нарэшце, адпачыць з сям'ёй тут жа. Па звестках аддзела адукацыі гарвыканкама, на сённяшні момант амаль 1500 малых з гэтага раёна маюць патрэбу ў наведванні садка, а гэта значыць, што разам з дзіцячымі ўстановамі, якія тут існуюць, яшчэ неабходна пабудаваць некалькі новых... Дарэчы, як і яшчэ адну школу, што павінна адчыніць свае дзверы 1 верасня.

— Нельга паўтараць памылку, таму далейшае будаўніцтва жылля будзе весціся ў паўночным кірунку і ў мікрараёнах, дзе ўжо ёсць неабходная інфраструктура, — падкрэсліў кіраўнік горада.

Разам з тым у Альшанцы сёлета запланавана ўвесці другую дзіцячую амбулаторыю, распачаць будаўніцтва паліклінікі і, згодна з абяцаннем жыхарам мікрараёна, штогод будаваць па адным дзіцячым садку.

І яшчэ адзін галоўны аб'ект, будаўніцтва якога неабходна гораду, — анкадыспансер. Дарэчы, Гродна — адзіны абласны цэнтр у краіне, дзе няма такой клінікі.

Як паведаміў Мечыслаў Гой, пад гэтыя мэты запланавана рэканструкцыя 3-й гарадской паліклінікі і накіравана 200 мільёнаў рублёў, ільвіная доля грошай пойдзе на закупку неабходнага абсталявання. У лютым павінна ўжо быць гатовая экспертыза праекта.

### ДРУГОЕ КАЛЬЦО

Разам з ростам горада расце і аўтапарк гараджан. Як прадугледжвалася генпланам, распрацаваным у 2003 годзе, летась на тысячу жыхароў павінна было быць 350 жалезных «коней». Аднак жа рэальнасць аказалася іншай: 470 аўтамабіляў прыйшлося ў 2018-м на тысячу гараджан. Да таго ж тут не ўлічаныя транзітныя патокі і замежныя грузы. Як вынік — развіццё дарожнай сеткі таксама не адпавядае сённяшнім рэаліям.

Па словах Мечыслава Гоя, ужо ў красавіку распачнецца першая чарга рэканструкцыі старога чыгуначнага моста церас Нёман пад аўтамабільны, які звяжа вуліцы Паўднёвую з Кляцкова з выездам на аўтамагістраль М6. У будучыні гэта стане адным з участкаў другой кальцавой гарадской магістралі, у якой ёсць патрэба. Існуюць планы і па рэканструкцыі вуліцы Каліноўскага са зносам прыватнай забудовы і выпраўленнем дарогі.

Шмат пытанняў гараджане задавалі наконт стану пляцовак для выгулу сабак, наогул культуры ўтрымання хатніх жывёл і стасункаў з суседзямі адносна балючай тэмы «неспадзяваных» кучак. Так, праблема з выгулам існуе, пагаджаецца кіраўніцтва горада, таму камунальнай службе даручана вывучыць стан пляцовак і прыняць адпаведныя захады па яе вырашэнні. А яшчэ ёсць другая праблема, звязаная з хатнімі любімцамі: у Гродне няма могілак для пахавання чатырохногіх сяброў.

— Гэтую праблему мы таксама вырашым, — паабяцаў гараджанам мэр.

### ПАДАРУНАК ДА ФЕСТЫВАЛЮ

Два гады Гродна працуе ў бязвізавым фармаце. Што гэта дае гораду і як заахвоціць замежнікаў часцей да нас прыязджаць? Гэтыя пытанні таксама гучалі на сустрэчы.

Як адзначыў старшыня гарвыканкама, толькі летась абласны цэнтр наведала каля ста тысяч турыстаў з 70 краін свету. Між іншым, тут не ўлічаны госці, што наведваюць Беларусь свабодна, без перасячэння мяжы, напрыклад, расіяне, якія вельмі любяць адпачываць у беларускіх санаторыях і аграсядзібах.

— Мы імкнёмся, каб горад набываў свае цікавінкі і да нас імкнуліся госці: дзякуючы гэтаму з'яўляюцца новыя кафэ, гатэлі, хостэлы (нават капсульнага тыпу)... Але гэтыя віды бізнесу — прыватныя. Гарадская ж улада павінна займацца дзіцячымі садкамі, школамі, паліклінікамі, дарогамі, — падкрэсліў Мечыслаў Гой.

Цікавіць, безумоўна, гасцей і гісторыя. Не засталося падчас сустрэчы па-за кадрам і пытанне рэканструкцыі Старога замка. Як паведаміў мэр Гродна, першая чарга рэканструкцыі гэтага важнага аб'екта павінна завяршыцца да наступнага рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, што адбудзецца ў 2020-м.

Ёсць намер прывесці ў належны стан і сцэлу ў Каложскім парку па праграме трансгранічнага супрацоўніцтва.

Наогул, дзве гадзіны прабеглі ў адказах на шматлікія пытанні як некалькі хвілін... Зразумела, што не ўсе знайшлі сваё адлюстраванне з-за абмежаванага фармату ў газетным артыкуле, і, каб закончыць на аптымістычнай ноце, згадаю яшчэ адзін адказ, які датычыўся развіцця талентаў у дзяцей і падлеткаў.

Па словах Мечыслава Гоя, падчас нядаўняга візіту ў Гродна вядомага выхаваўцы «Ласкавага мая» Андрэя Разіна апошні выказаў намер стварыць дзіцячы творчы цэнтр пад эгідай праекта «Сонечнае кола» — школу для дзяцей-сірот і таленавітай моладзі, каб тыя мелі магчымасць займацца эстраднай музыкай.

**Вольга АНУФРЫЕВА,**
**дэпутат Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў па Паўднёвай выбарчай акрузе № 22.**



# Дайсці трэба да кожнага

**Дэпутаты розных узроўняў у сераду, 30 студзеня, абмеркавалі ў Віцебску актуальныя тэмы, якія датычацца кожнага жыхара Прыдзвінскага краю**

**Абласны семінар «Аб рабоце органаў мясцовага кіравання і самакіравання па рашэнні некаторых пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва» пачаўся з узнагароджвання найбольш актыўных.**

Цікава, што сярод іншых ганаровыя граматы ад старшыні аблсавета дэпутатаў Уладзіміра Цярэнцьева атрымалі старэйшыны вёсак. Чарговы раз ён нагадаў, што менавіта гэтыя людзі дапамагаюць вырашаць актуальныя праблемы землякоў. Яны як звяно паміж уладай і людзьмі.

Віцебшчына — лідар сярод абласцей па колькасці населеных пунктаў — больш чым 6,2 тысячы, амаль у палове вёсак жывуць ад пяці да дзесяці чалавек...

На семінары прагучала і тэма падрыхтоўкі да знамянальных свят. У прыватнасці, у лютым — 30-гадовы юбілей вываду савецкіх войскаў з Афганістана. Таму трэба, каб кожны з тых, хто выконваў інтэрнацыянальны доўг, адчуў павагу, клопат. І калі трэба, мясцовая ўлада павінна аказаць падтрымку ў лячэнні і іншых пытаннях. Вобласць актыўна рыхтуецца годна адсвяткаваць і 75-гадовы юбілей вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. І канешне, у цэнтры ўвагі павінны быць тыя, каму мы абавязаны Перамогай.

Ішла гаворка і аб тым, што робіцца па папярэджанні гібелі і траўматызму людзей пры ўзнікненні пажараў, іншых надзвычайных сітуацый. А таксама аб мерах, якія прымаюцца праваахоўнікамі сумесна з органамі мясцовага кіравання і самакіравання па прафілактыцы злачынстваў і правапарушэнняў.

Шмат увагі было аддадзена і вельмі актуальнай тэме садзейнічання ў працаўладкаванні тых, хто не заняты ў эканоміцы. На Віцебшчыне каля 11,8 тысячы грамадзян не працуюць, пры гэтым не з'яўляюцца беспрацоўнымі. Старшыня аблсавета нагадаў, што такія цяпер павінны поўнасцю аплачваць некаторыя камунальныя паслугі. Але, каб не было памылак, трэба вельмі ўважліва пераправерыць адпаведныя спісы. У некаторых раёнах гэта праца завершана. Але ёсць рэгіёны, дзе яшчэ мясцовая ўлада не валодае поўнай інфармацыяй. І трэба ўважліва вывучыць кожны выпадак індывідуальна, давесці да ведама людзей патрабаванні Дэкрэта № 3. Адказныя асобы павінны зрабіць усё магчымае, каб людзі маглі знайсці сабе занятак, плаціць падаткі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**